# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦОЎНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ З ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЙ НЕДАСТАТКОВАСЦЮ (частка 2)

Сячкоўская Лідзія Рыгораўна,
старшы выкладчык
кафедры спецыяльнай педагогікі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПЛАН ЛЕКЦЫІ

1. Агульнапрацоўныя (інтэлектуальныя) уменні і асаблівасці іх развіцця ў вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю.
2. Характарыстыка асаблівасцяў авалодання рухальнымі працоўнымі навыкамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# АГУЛЬНАПРАЦОЎНЫЯ (ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫЯ) УМЕННІ

- Уменне арыентавацца ў заданні;
- уменне планаваць працэс выканання задання (ход работы);
- уменне ажыццяўляць самакантроль;
- умення выкарыстоўваць у працэсе працы навыкі вылічэння, вымярэння і разметкі, выкарыстоўваць мінулы досвед, усталёўваць прычынна-выніковыя сувязі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ТЫПОВЫЯ ПРАЯВЫ АСАБЛІВАСЦЯЎ РАЗВІЦЦЯ АГУЛЬНАПРАЦОЎНЫХ УМЕННЯЎ У ВУЧНЯЎ З ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЙ НЕДАСТАТКОВАСЦЮ

| *Арыенціроўка ў заданні* | *Планаванне ходу работы* | *Самакантроль* |
|---|---|---|
| ➢ Прыступаюць да практычнага выканання задання без належнай папярэдняй арыенціроўкі;<br>➢ папярэдні аналіз вырабу бессістэмны, непаслядоўны, няпоўны;<br>➢ у працэсе папярэдняй арыенціроўкі ў заданні не вызначаюць самастойна ўмовы выканання задання;<br>➢ на этапе арыенціроўкі ў заданні праяўляюць нізкі ўзровень маўленчай актыўнасці. | ➢ Самастойна не спрабуюць папярэдне вызначыць план сваіх дзеянняў;<br>➢маюць цяжкасці ў выкананні задання паводле плана, прадстаўленага ў выглядзе пісьмовай або вуснай інструкцыі;<br>➢ без спецыяльнага навучання не кіруюцца ў належнай меры ўзорамі прадметных тэхналагічных або малюнкамі графічных тэхналагічных карт. | ➢ Для выканання кантрольных дзеянняў часта патрабуецца заахвочванне з боку настаўніка;<br>➢ асабліва цяжкім з'яўляецца параўнанне вырабаў па некалькіх прыкметах;<br>➢ у параўнанні з канстатуючым самакантролем больш выяўляюцца недахопы карэктуючага самакантролю. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ШЛЯХІ РАЗВІЦЦЯ УМЕННЯЎ АРЫЕНТАВАЦЦА Ў ЗАДАННІ Ў ВУЧНЯЎ З ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЙ НЕДАСТАТКОВАСЦЮ Ў І–V КЛАСАХ

- Паступовае скарачэнне дапамогі ў выкананні арыенціровачных дзеянняў;
- выкарыстанне ў працэсе арыенціроўкі ў заданні розных відаў нагляднасці – рэальнага аб'екта (узору вырабу), яго выявы на тэхнічным малюнку, фатаграфіі;
- прымяненне ў працэсе арыенціроўкі ў заданні як вусных, так і пісьмовых (з IV класа) інструкцый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПАСЛЯДОЎНАСЦЬ ФАРМІРАВАННЯ ЎМЕННЯ АРЫЕНТАВАЦЦА Ў ЗАДАННІ

- Паўтарэнне вычнямі прыкмет вырабу, якія вылучае і называе настаўнік;
- аналіз вырабу па пытаннях настаўніка і з яго дапамогай у фармулёўцы адказаў;
- аналіз вырабу па пытаннях настаўніка;
- самастойны аналіз вырабу, аналагічнага раней выкананым.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПАСЛЯДОЎНАСЦЬ ФАРМІРАВАННЯ ЎМЕННЯ ПЛАНАВАЦЬ ПРАЦУ

- Выкананне працы на аснове паказу і славеснай інструкцыі настаўніка;
- планаванне знаёмай бліжэйшай аперацыі;
- папярэдняе планаванне работы на аснове пытанняў і з дапамогай настаўніка;
- папярэдняе планаванне работы на аснове пытанняў настаўніка;
- самастойнае папярэдняе планаванне работы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПАСЛЯДОЎНАСЦЬ ПАВЫШЭННЯ САМАСТОЙНАСЦІ ВЫКАНАННЯ ПРАМЕЖКАВАГА І ВЫНІКОВАГА КАНТРОЛЮ

- Па ўказанні на канкрэтны элемент (прыкмету) вырабу (аб'екта работы) і з дапамогай настаўніка ў ажыццяўленні параўнання;
- па ўказанні настаўніка на канкрэтны элемент (прыкмету) вырабу (аб'екта работы);
- пасродкам паэлементнага параўнання свайго вырабу (аб'екта працы) з узорам (малюнкам) з дапамогай настаўніка;
- з мінімальнай (стымулюючай) дапамогай настаўніка;
- самастойна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПАСЛЯДОЎНАСЦЬ ПАВЫШЭННЯ САМАСТОЙНАСЦІ ВЫКАНАННЯ КАРЭКТУЮЧАГА КАНТРОЛЮ

- З дапамогай паказу і славеснай інструкцыі настаўніка;
- паводле славеснай інструкцыі настаўніка;
- з мінімальнай (стымулюючай) дапамогай настаўніка;
- самастойна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ХАРАКТАРЫСТЫКА АСАБЛІВАСЦЯЎ АВАЛОДВАННЯ РУХАЛЬНЫМІ ПРАЦОЎНЫМІ НАВЫКАМІ (пачатак)

- Адмоўны ўплыў на фарміраванне рухальных навыкаў асаблівасцяў маторыкі (запаволенасць рухаў, нязграбнасць, нераўнамерны характар рухаў);
- цяжкасці авалодання вышэйшымі адвольнымі рухамі, развіццё якіх апасродкавана маўленнем;
- парушэнні дакладнасці, тэмпу, рытму, каардынацыі працоўных рухаў;
- няўменне рэгуляваць сілу сваіх рухаў, павялічваць і памяншаць яе ў адпаведнасці з патрабаваннямі выконваемай аперацыі;
- выкананне вялікай колькасці лішніх рухаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ХАРАКТАРЫСТЫКА АСАБЛІВАСЦЯЎ АВАЛОДВАННЯ РУХАЛЬНЫМІ ПРАЦОЎНЫМІ НАВЫКАМІ (працяг)

- запаволеная аўтаматызацыя першасна асвоеных рухальных навыкаў;
- цяжкасці пры неабходнасці кантраляваць свае рухі па многіх параметрах: кірунку, амплітудзе, паслядоўнасці, тэмпу і г.д .;
- складанасці пераносу навыку, г.зн. выкарыстанне знаёмага прыёму ў новых умовах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЛІТАРАТУРА

1. Трудовое обучение. Учебная программа для I–V классов первого отделения вспомогательной школы с русским языком обучения [Электронный ресурс] / Мин. образования Респ. Беларусь. – Режим доступа: http://asabliva.by/sm_full.aspx?guid=84813. – Дата доступа: 08.02.2016.

2. Шинкаренко, В. А. Методика трудового обучения младших школьников с интеллектуальной недостаточностью: учеб.-метод. пособие для педагогов учреждений спец. образования с белорус. и рус. яз. обучения / В. А. Шинкаренко. – Минск : Изд. центр БГУ, 2013. – 103 с

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ